*Упершыню з цыклям гутарак „Пад знакамі Арла й Пагоні" мелі магчымасьць пазнаёміцца Слухачы Беларускай Службы Радыё Палёнія ў 1992 годзе.*

**Рэдактар: др Ніна Баршчэўская**

**Тэхнічны рэдактар: Яраслаў Іванюк**

**Выдавец: Villa Sokrates, Крынкі (Польшча)**

**ISBN 83-913706-3-1**

**Друк: *Offset-Print***

**Спонсар: Маршалкоўская Ўправа Падляшскага ваяводзтва (Беласток)**

*Сардэчна дзякуем Генадзю Сагановічу за дапамогу ў графічным афармленьні кніжкі*

# *Ад Аўтара*

*Кніжка „Пад знакамі Арла й Пагоні" ўяўляе сабою збор кароткіх гутарак, прысьвечаных польска-беларускім суадносінам у гісторыі. Гэта ня выклад гісторыі Беларусі, але вольны пераказ цікавейшых момантаў у фармаваньні беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, культуры, таксама пад уплывам палякаў; менавіта — момантаў, якія павінны зацікавіць Шаноўнага Чытача й заахвоціць да заглыбленьня ў родную мінуўшчыну.*

*Беларусы фармаваліся пад заходнім уплывам (а ня ўсходнім), галоўным чынам праз польскае пасярэдніцтва, найперш у рамках Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Расейскія ўзьдзеяньні не адыгрывалі тады істотнай ролі ў Белай Русі з увагі на азіяцкую адсталасьць і прымітывізм самое Расеі.*

*Нацыя як найвышэйшая форма разьвіцьця этнічнае супольнасьці — гэта тыпова эўрапейская зьява. Без нацыянальнае сьвядомасьці немагчымы цывілізацыйны рост. Несьвядомых сваіх каранёў чакае альтэрнатыва — альбо асыміляцыя ў чужароднасьць, альбо адстой.*

*Трэцяга выхаду не існуе.*

KAMUNIKAT.ORG